# ПРА ЖЫЛЛЁ, ЗДАРОЎЕ І СУМЛЕННЕ

## З якімі пытаннямі людзі званілі Наталлі Качанавай

**РАБОТА са зваротамі грамадзян у Савеце Рэспублікі праводзіцца пастаянна і ў самых розных формах: ад выязных рэгіянальных сустрэч да прамых тэлефонных ліній, высокая колькасць званкоў падчас якіх сведчыць пра запатрабаванасць такой формы работы. Людзям зручна набраць нумар і расказаць пра сваю праблему непасрэдна сенатару, лічаць у Савеце Рэспублікі. Пры гэтым тыя, хто дазваніўся, могуць быць упэўненыя, што кожнае пытанне атрымае лагічнае завяршэнне і ўсім заяўнікам абавязкова паведамяць пра вынік афіцыйна. Пра такі алгарытм работы абавязкова паведамляюць кожнаму, хто тэлефануе. На чарговы «тэлефонны прыём» да Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай людзі звярталіся з самымі рознымі пытаннямі: ад добраўпарадкавання каля дома і скаргі на няякасную аперацыю да просьбы змякчыць некаторыя моманты ў заканадаўстве і дапамагчы выратавацца ад несумленнага крымінальнага пераследу.**

### Дзіцячая пляцоўка, квота на паступленне, усынаўленне

Людзі, якія тэлефанавалі ў той дзень сенатару, дзяліліся сваімі праблемамі, спадзеючыся, што на такім высокім узроўні яны абавязкова будуць пачутыя і атрымаюць дакладную дапамогу.

Юлія з Бабруйска з сям'ёй вось ужо год жыве ў новым доме, і дагэтуль чакае, пакуль на дзіцячай пляцоўцы перад домам уладкуюць бяспечнае гумавае пакрыццё, а побач з домам — насыплюць якасны грунт, каб не расло пустазелле, і зробяць прыступкі, каб было зручна рухацца з дзіцячай каляскай. Выслухаўшы, Наталля Качанава тут жа дала заданне звязацца з мясцовым выканкамам.

Юлія з мужам і чатырма дзецьмі (дзве родныя дачкі і два ўсыноўленыя хлопчыкі-браты) жыве ў інтэрнаце ў мікрараёне Сокал, раней жыла ў Калінкавічах. Яе муж, родам з Латвіі, атрымаў пасведчанне на жыхарства пяць гадоў таму.

— Мы хацелі стаць на чаргу асоб, якія маюць патрэбу ў жыллі, прычым на звычайную, а не як шматдзетныя. Аднак для гэтага трэба пражыць дзесяць гадоў у Мінску, а ў нас летам будзе толькі пяць. Ці можна неяк змяніць умовы? Мы ўсынавілі дзетак, не разлічваючы на нейкую карысць ці прывілеі. Мы не атрымліваем ніякіх даплат за іх, удзельнічаем ва ўсіх сямейных конкурсах, выхоўваем дзяцей у любові да Беларусі.

— Сапраўды, чужых дзяцей не бывае, і ваш учынак заслугоўвае павагі, бо далёка не кожны зможа ўсынавіць чужое дзіця. Мы вывучым, што можна будзе зрабіць, і абавязкова вам паведамім, — паабяцала Старшыня Савета Рэспублікі.

### Даведзена да крыміналу, інваліднасці і вымоў

Былі і вельмі сур'ёзныя звароты, якія датычацца здароўя і жыцця людзей.

Леанід з Жодзіна літаральна за хвіліну агучвае сваю просьбу: навесці парадак у медыцыне — ён скардзіцца, што пасля інсульту ўжо каторы месяц не можа трапіць да ўрача. Наталля Качанава гэтак жа лаканічна запісвае каардынаты мужчыны і пазначае сабе ў той жа дзень звязацца з міністрам аховы здароўя Дзмітрыем Піневічам.

Віктар з Асіповіцкага раёна стаў інвалідам па зроку пасля няўдалага лячэння вока, хоць хвароба пачыналася з пачырвання, і ён спадзяецца, што можа яшчэ аднавіць сваю працаздольнасць, калі атрымае прафесійную дапамогу. Старшыня Савета Рэспублікі абяцала адправіць мужчыну да вядучага афтальмолага Беларусі: «Вам пазвоняць і скажуць, калі і куды пад'ехаць».

Наталля з Гродна — сама ўрач і расказала, што пацярпела з-за... сваёй сумленнасці, калі стала абараняць правы аднаго з пацыентаў, бо яму не аказвалі меддапамогу ў поўным аб'ёме. Цяпер у жанчыны ўжо дзве вымовы і яна баіцца, што яе звольняць, і чакае дапамогі ад сенатара.

Алена з Барысава вось ужо тры гады шукае праўды пра забойства свайго 35-гадовага сына:

— Мне ўжо колькі разоў адказвалі, што справу трэба пасылаць на даследаванне, бо не было праведзена поўнае расследаванне. Экспертыза паказала, што ў сына было 60 цялесных пашкоджанняў, удары наносіліся рукамі і нагамі, быў пералом чэрапа. Аднак справу завялі толькі за забойства, а потым закрылі яе, бо пастанавілі, што сын сам упаў. А справы за нанясенне пашкоджанняў не адкрывалі, — кажа жанчына. — У выніку справу аб забойстве закрылі за недаказанасцю, бо пастанавілі, што сын сам мог упасці і атрымаць пералом чэрапа.

Прычым найбольш верагодным забойцам яе сына лічаць чалавека, у кватэры якога і было знойдзена цела. Гаспадара ж кватэры ўсе ў горадзе ведаюць як агрэсіўнага і жорсткага чалавека, які не саромеецца збіваць уласную маці, і яго баяцца.

— Я сама асабіста звярнуся да кіраўніка Следчага камітэта, каб у справе разабраліся, — запэўніла ўражаная Наталля Качанава. — А з вамі звяжацца мая памочніца, бо калі ёсць чалавек, які стварае пагрозу для тых, хто жыве побач, то з такой сітуацыяй трэба таксама разабрацца.

Таццяна з Мінскага раёна просіць выратаваць яе мужа, на якога завялі крымінальную справу пасля палявання з калегамі па рабоце.

— Муж аплаціў усе дазволы і ліцэнзіі на паляванне, яны здабылі звера, начальнік палявання падзяліў мяса паміж удзельнікамі. Але мужу, хоць ён прасіў неаднаразова, не далі адрыўнога білета, які дазволіў бы спакойна перамяшчаць прадукт. У выніку яго спыніла прыродаахоўная інспекцыя. Спачатку казалі, што будзе адміністрацыйная адказнасць, аднак пазней на мужа завялі крымінальную справу, канфіскавалі аўто і цяпер хочуць пасадзіць, — плача жанчына.

Сенатар папрасіла перадаць ёй копіі ўсіх адказаў з устаноў, у якія звярталіся сужэнцы, каб дамагчыся праўды і растлумачыць, што віны мужчыны няма і ніякай шкоды прыродзе і дзяржаве ён не зрабіў. Наталля Качанава запэўніла, што перадасць іх у адпаведныя інстанцыі для разбору, і паабяцала, што калі трэба, дапаможа сужэнцам трапіць да старшыні Вярхоўнага Суда Валянціна Сукалы.

### Высокія плацяжы ў таварыстве ўласнікаў і па арэндным жыллі

Неаднаразова ўзнікаюць і пытанні па дзейнасці таварыстваў уласнікаў, у прыватнасці, аб налічэнні аплаты за абслугоўванне будынкаў: як жылых, так і адміністрацыйных, дзе грамадзяне маюць памяшканні для работы, а таксама садовых таварыстваў. Літаральна адна за адной пазванілі дзве жанчыны, адна з якіх (Святлана з Мінска) скардзілася на вялікую плату за 38 м² офіса, якім яна валодае:

— Са 190 рублёў, якія я плачу, 60 — камунальныя плацяжы, а астатняе ідзе невядома на што. Нядаўна збудавалі казырок над пад'ездам, а выставілі каштарыс у 180 тысяч рублёў і называюць гэта рамонтам.

Сенатар на гэта заўважыла, што накіруе запыты старшыні Мінгарвыканкама Уладзіміру Кухараву і міністру ўнутраных спраў Івану Кубракову.

Другая жанчына (мінчанка Ларыса) просіць дапамагчы знайсці архіў садовага таварыства ў Валожынскім раёне, каб атрымаць дакументы, якія пацвярджаюць легітымнасць старшыні.

— Калі я атрымаю такія дакументы, то пайду з імі ў суд, каб прызнаць копію даведкі, што ў мяне ёсць, арыгіналам. Згодна з арыгіналам быў аформлены тэхпашпарт на дом у СТ, яе ў выканкаме згубілі, і цяпер я не магу аформіць права ўласнасці і атрымаць новую даведку, ёсць толькі копія.

Наталля Качанава паабяцала дапамагчы ў дадзеным пытанні і заўважыла, што скаргаў на старшынь ТУ і СТ сапраўды шмат, менавіта таму і ўдасканальваецца закон па таварыствах уласнікаў.

Ліліяна ўсё жыццё жыве ў службовых кватэрах і нават не задумвалася над прыватызацыяй. Апошняе такое жыллё яна атрымала ў 2009 годзе, пазней яно было пераведзена ў разрад камерцыйнага, а потым — арэнднага. Цяпер жанчыну хочуць выселіць, бо яна звольнілася з работы. А яшчэ яна скардзіцца, што да камунальных плацяжоў па яе жыллі не прымяняецца паніжальны каэфіцыент, і за «камуналку» выходзіць па 600—700 рублёў, а гэта амаль уся зарплата, што ў яе была.

— З вамі неадкладна звяжацца мая памочніца, а вы перадасце ў Савет Рэспублікі ўсе паперы, якія датычацца вашага жылля, — рэзюмавала сенатар.

**Ірына СІДАРОК.**

# Цягнік па маршруце Памяці

**Сёння ў Брэсце стартуе «Цягнік Памяці». Першы маршрут гэтага інтэграцыйнага праекта быў апрабаваны летась, і ўжо тады стала зразумела: закладваецца добрая традыцыя. Праект патрыятычнай накіраванасці і, што галоўнае, — разлічаны менавіта на моладзь. Падрабязна пра яго нам расказала Ірына СТАРАВОЙТАВА, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:**

— Сумесны беларуска-расійскі культурна-адукацыйны праект «Цягнік Памяці» быў ініцыіраваны Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай і Старшынёй Савета Федэрацыі Валянцінай Матвіенкай і ўпершыню рэалізаваны летась. Сёлета да нас далучыліся яшчэ дзве краіны — Кыргызстан і Арменія. Усяго ў праекце возьмуць удзел 200 навучэнцаў з Расіі, Беларусі, Кыргызстана і Арменіі.

Старт будзе дадзены ў Брэсце ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой». Кожны дзень удзельнікаў будзе напоўнены мноствам патрыятычных акцый, адукацыйных сустрэч, культурна-асветных мерапрыемстваў.

Праграма праекта вельмі насычаная, у тым ліку ў ёй ёсць месца для інтэрактыўных пляцовак, камандных гульняў і іншага. Нам бы хацелася расказаць удзельнікам «Цягніка...» як мага больш пра нашы краіны, пра іх гісторыю, пра падзеі і людзей.

Дзеці наведаюць памятныя мясціны: музеі летапісу і абароны Брэсцкай крэпасці, мемарыяльны комплекс у Красным Беразе, прысвечаны дзецям — ахвярам Вялікай Айчыннай вайны, Буйніцкае поле, «Лінію Сталіна», Курган Славы, помнік «Вызваліцелям Полацка». На тэрыторыі Расійскай Федэрацыі запланавана наведванне Піскароўскіх мемарыяльных могілак у Пецярбургу, мемарыяльнага комплексу «Героям Сталінградскай бітвы» на Мамаевым кургане, экскурсійная праграма па «Партызанскай вёсцы», наведванне Музея Перамогі ў Маскве.

Праект таксама ўключае ў сябе і азнаямленне ўдзельнікаў з культурай і сучаснасцю нашых краін. Так, сёлета запланавана наведванне Трафімавай крыніцы, гісторыка-краязнаўчага музея ў Александрыйскай сярэдняй школе Шклоўскага раёна, замкаў Гродна, музея гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора ў Полацку. Увазе школьнікаў будзе прапанаваны прагляд спектакляў «Васіль Цёркін» і «Гісторыя роду Талстых — гісторыя Расіі».

Варта адзначыць, што «Цягнік Памяці» стаў знакавым праектам, ён адыгрывае важную ролю ў рабоце з моладдзю, выхаванні яе ў духу патрыятызму. Бо патрыятызм — гэта перш за ўсё духоўны стан асобы, які выяўляецца ў яе светапоглядзе, маральных ідэалах і нормах паводзін. Патрыятызм праяўляецца ў адносінах да гісторыі, культуры, дзяржавы, уключае сістэму асноўных каштоўнасцяў.

Таму так важна, каб у памяці ўдзельнікаў праекта захаваліся сіла народнага супраціўлення, нязломная воля, подзвігі воінаў, якія змагаліся за свабоду ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў імя будучых пакаленняў. Гэта яшчэ раз пераканае іх у значнасці незалежнасці краіны, каштоўнасці міру на Зямлі.

***Нашы карэспандэнты пазнаёміліся з удзельнікамі праекта з розных рэгіёнаў Беларусі і пераканаліся: на «Цягніку Памяці» сапраўды едуць самыя дастойныя.***

## «УПЭЎНЕНА, ШТО ВЯРНУСЯ ІНШЫМ ЧАЛАВЕКАМ»



### Дзесяцікласніца з Ельска конкурснае эсэ пісала аб прадзеду і прабабулі

**У падарожжа на «Цягніку Памяці» адправіцца і вучаніца 10 класа Ельскай раённай гімназіі Ксенія Баранкевіч — фіналістка абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу «Я патрыёт сваёй краіны».**

На працягу ўжо некалькіх гадоў Ксенія бярэ актыўны ўдзел у конкурсах прамоўніцкага майстэрства, чытання вершаў. Яе любімыя творы для прачытання — паэзія Уладзіміра Караткевіча, Сяргея Ясеніна і Уладзіміра Маякоўскага.

— Калі рыхтуюся да конкурсаў, стараюся не звяртацца па дапамогу ні да педагогаў, ні да бацькоў. Прапрацоўваю ідэі выступленняў самастойна, — адзначае вучаніца. — Калі рыхтавалася да конкурсаў на патрыятычную ваенную тэматыку, арыентавалася на інфармацыю ў шматтомніку «Памяць». У выданні, на маю думку, вельмі поўна пададзены звесткі пра воінаў, якія ваявалі ў Вялікую Айчынную вайну.

Сярод творчых спаборніцтваў, на якіх школьніца з годнасцю прадстаўляла свой Ельскі раён, — штогадовы Гомельскі абласны конкурс прамоўніцкага майстэрства. Ксенію асабліва ўразіла заданне скласці апавяданне-імправізацыю.

— Тэмы агучваюцца непасрэдна на конкурсе, і нельга загадзя дома падрыхтавацца. На апошнім конкурсе абрала выступленне-разважанне над афрыканскай мудрасцю: «Нават калі рака высахне, яе вытак будзе заўжды памятаць яе імя...» Я вельмі люблю вывучаць гісторыю. Цікаўлюся ваеннай гісторыяй Беларусі і роднага Ельскага раёна. Таму расказвала аб героях Вялікай Айчыннай вайны, імёны якіх назаўжды будуць помніць на маёй малой радзіме. На абласным этапе гэтага конкурсу заняла другое месца. Вельмі было прыемна і нечакана, што ў раёне мяне за гэту работу падтрымалі прэміяй.

Сёлета вучаніца Ельскай раённай гімназіі ўпершыню паспрабавала свае сілы ў конкурсе «Я патрыёт сваёй краіны» ў межах беларуска-расійскага патрыятычнага культурна-адукацыйнага праекта «Цягнік Памяці».

— Праходзіў вельмі сур'ёзны адбор. Першым этапам конкурсу былі эсэ і відэапрэзентацыі. Неабходна было зняць ролікі аб сваім родным населеным пункце, аб сабе. Я раней ніколі гэтым не займалася, так што гэта быў своеасаблівы выклік, — патлумачыла Ксенія. — Эсэ пісала пра сваіх прабабулю і прадзеда, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне. Сярод заданняў таксама быў творчы нумар: чытала верш. На другім этапе праходзіла інтэлектуальную віктарыну «Квіз» і рыхтавала ўжо зноў новую візітоўку і творчы нумар. Для адказу на кожнае пытанне «Квізу», напрыклад, давалася 30 секунд. Пытанні былі даволі складаныя. У залежнасці ад тураў яны датычыліся дзейнасці Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама ведання кінастужак, гісторыі Беларусі. Загадзя ўвогуле не была вядома тэматыка гэтых заданняў.

Пры адборы ў конкурсе «Я патрыёт сваёй краіны» ўлічвалася ў тым ліку паспяховасць школьнікаў, іх удзел у грамадскай рабоце. Ксенія распавяла, што ўпершыню будзе прадстаўляць на праекце «Цягнік Памяці» свой раён.

— Еду адна ад нашага раёна, і гэта вельмі хвалююча, бо ўвогуле ўпершыню вазьму ўдзел у выязным мерапрыемстве такога фармату. Думаю, для мяне гэта выпрабаванне не толькі эмацыянальнае, але і фізічнае. Цяпер настройваюся псіхалагічна. Упэўнена, што вярнуся з праекта адназначна ўжо іншым чалавекам. Бо гэта будзе неверагодны не толькі пазнавальны, але і жыццёвы вопыт. У плане і сацыялізацыі, і агульнай дзейнасці з аднагодкамі, — падзялілася Ксенія.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

## «ЧАКАЮ ЯК ЗНАКАВУЮ ПАДЗЕЮ Ў СВАІМ ЖЫЦЦІ»

### Брастаўчанка, якая ведае свае карані



**Марына Велясніцкая адна такая ў сваёй паралелі ў гімназіі № 6 Брэста: дзясяты клас дзяўчына скончыла з сярэднім балам «10». Яна вучыцца ў класе эканамічнага профілю, але аднолькава любіць гісторыю, літаратуру, матэматыку і па ўсіх прадметах мае дзясяткі. Кажа, што яшчэ не выбрала, куды будзе паступаць пасля школы — на гуманітарны факультэт ВНУ ці ўсё ж аддасць перавагу дакладным навукам. Наперадзе — амаль год, ёсць час падумаць.**

Некалькі гадоў запар Марына ўдзельнічае ў алімпіядным руху розных кірункаў: ходзіць на алімпіяды як па матэматыцы, так і па рускай мове. Любіць сумленнае спаборніцтва. Магчымасць паўдзельнічаць у конкурсе за склад будучай каманды «Цягніка Памяці» Марына ўспрыняла з асаблівым энтузіязмам. І ўсе яго этапы прайшла паспяхова. Напрыклад, адрасам конкурснага праекта «Мая малая радзіма» выбрала не горад, у якім нарадзілася і вырасла, які любіць, а вёску свайго бацькі — Гарадную Столінскага раёна. У Гараднай жыве бабуля, там Марына бывае кожнае лета і даўно ўспрымае населены пункт як свой родны кут. Пра Гарадную дзяўчына можа гаварыць доўга і цікава. Яна і расказвае ў сваім відэасюжэце аб працавітых людзях Палескага краю. Распавядае аб традыцыях ганчарства, даўнейшых майстрах тутэйшай зямлі, а таксама іх нашчадках, якія не забыліся дзедаўскую справу, адрадзілі яе і цяпер навучаюць сваіх дзяцей ляпіць гаршкі, гладышы, іншы посуд.

У сачыненні-эсэ пра подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне Марына расказала адну з гісторый сваёй сям'і. Яе прадзед па матулінай лініі Мікалай Фёдаравіч Драгункін, 1912 года нараджэння, вайну прайшоў ад званка да званка. Прабабуля Антаніна, калі муж пайшоў на фронт, пакінула на сваякоў маленькае дзіця і служыла ў ваенных абозах, каб быць побач з мужам. Яны былі франтавікамі, засталіся жыць, пражылі дастойна і застаюцца служыць прыкладам для нашчадкаў. «Амаль у кожнай сям'і ёсць падобная гісторыя, — лічыць Марына, — трэба толькі цікавіцца, распытваць бабуль, прабабуль, з іх дапамогай пісаць свой сямейны летапіс».

Многа новага спадзяецца даведацца, адкрыць для сябе дзяўчына падчас паездкі па гарадах Беларусі і Расіі. У расійскіх гарадах Маскве і Санкт-Пецярбургу яна бывала і раней, калі дзіцячы ансамбль народнага танца «Праменьчык» удзельнічаў у розных конкурсах і канцэртах. Марына танцавала ў калектыве некалькі гадоў. «Але там былі дзіцячыя ўражанні. А цяпер мы будзем у розных гарадах наведваць музеі, помнікі, памятныя мясціны. Цікава, што з намі едуць аднагодкі з Расіі, Арменіі і Кыргызстана. Гэта ж новыя знаёмствы, незабыўныя сустрэчы, уражанні. Чакаю як знакавую падзею ў сваім жыцці», — сказала Марына Велясніцкая.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## «ХОЧАЦЦА ПАБАЧЫЦЬ ІНШЫЯ ГАРАДЫ І ЗНАЙСЦІ ВЕРНЫХ СЯБРОЎ»



### Дзяўчына са Слаўгарада выдатна вучыцца і займаецца валанцёрствам

**Слаўгарадчанка Ангеліна Струкачова як толькі даведалася, што ўвайшла ў каманду тых, хто будзе прадстаўляць Магілёўскую вобласць у праекце «Цягнік Памяці», ужо жыла прадчуваннем будучай паездкі. Расказвае, што дзякуючы свайму куратару — педагогу-арганізатару Слаўгарадскай школы № 2 Жанне Белавусавай — яна ўжо два гады адсочвае інфармацыю па гэтым праекце. Яго ўдзельнікі так захапляльна апісваюць падарожжа, што Ангеліна заразілася іх настроем. Ужо нават пасябравала з некаторымі з тых, з кім будзе ехаць. Пакуль завочна, але для людзей з агульнымі інтарэсамі межаў не існуе.**

За права ўвайсці ў лік шчаслівычкаў прыйшлося пазмагацца спачатку на раённым узроўні, потым абласным. Дзяўчына лічыць, што ёй вельмі пашчасціла.

— Я зрабіла відэаролік пра Слаўгарад, паспрабавала перадаць у ім свае эмоцыі і пачуцці і ён спадабаўся журы, — расказвае яна. — На абласным этапе сваю візітоўку я прадстаўляла на фоне відэароліка. Удзельнікі былі вельмі моцныя, было страшна, хвалююча — вельмі хацелася выйграць. Нас было 18 чалавек, і ўсе хацелі трапіць у гэты праект. Я была на сёмым небе, калі ўсё атрымалася.

Ангеліна лідар па прызванні, прывыкла быць у цэнтры падзей. Кажа, што гэта ў яе ад бацькоў. Маці на ўсе рукі майстар, добра спявае. Тата — будаўнік, любіць арганізоўваць вясёлыя сямейныя мерапрыемствы. У Слаўгарадзе жыве шмат радні — усе вельмі дружныя і кампанейскія: і працаваць, і адпачываць прывыклі талакой. Гэты вопыт Ангеліна перанесла і на сваю сяброўскую аўдыторыю. Яна камандзір валанцёрскага атрада «Божыя кароўкі». З усмешкай успамінае, што, калі прыдумвалі назву атраду, убачылі на сайце інтэрнэт-крамы касцюм багоўкі. «Эўрыка! Гэта ж цудоўная назва для каманды!» — агучыла Ангеліна ідэю. І сябры пагадзіліся. А каб было крэатыўна, сабралі грошы на той касцюм і набылі яго. Нельга без слёз успамінаць, як рэагаваў на іх сюрпрызы шасцігадовы хлопчык, вучань іх школы, калі валанцёры прыйшлі павіншаваць яго з Новым годам. Няўрымслівых дзяўчат і хлопцаў, якія разумеюць патрэбу людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў шчырым сэрцы і цёплых словах, добра ведаюць у слаўгарадскім аддзяленні сацыяльнай рэабілітацыі інвалідаў і забеспячэнні дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту. Яны там частыя госці. А яшчэ наводзяць парадак у месцах грамадскага карыстання. У Ангеліны ёсць падзяка ад мітрапаліта Веніяміна за ўдзел у акцыі па ачыстцы крынічкі ў Пацяраеўцы — аграгарадку Слаўгарадскага раёна. Летам дзеці ездзяць на веласіпедах на Блакітную крыніцу, дапамагаюць наводзіць чысціню там. Добрых спраў у скарбонцы Ангеліны шмат. І гэта не перашкаджае яе галоўнай справе — вучобе. Яна скончыла 10 класаў Слаўгарадскай сярэдняй школы № 2, прычым выключна на выдатна. Такі яна чалавек. Калі за нешта бярэцца, у яе руках усё гарыць. І словы на вецер не кідае. Як кажуць настаўнікі, калі Ангеліна нешта паабяцала, можна не сумнявацца — выканае.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Ангеліны СТРУКАЧОВАЙ.**

## «ПАТРЫЁТАМ БЫЦЬ ПАВІНЕН КОЖНЫ»



### Школьніца з Лёзна марыць насіць пагоны

**У «Цягніку Памяці» ад Віцебскай вобласці бяруць удзел восем навучэнцаў 10-х класаў устаноў сярэдняй адукацыі. Сярод іх — Юлія Сомава, вучаніца 10 «А» класа сярэдняй школы № 1 імя Героя Савецкага Саюза М. В. Акцябрскай г. п. Лёзна.**

Удзельнічаць у патрыятычным праекце Саюзнай дзяржавы школьніцы вельмі пачэсна, яна чакае ад «Цягніка» новых сяброў і яркіх эмоцый. А яшчэ лічыць, што гэта каштоўны шанц для абмену маладзёжнымі ініцыятывамі.

Юлія — актыўны член Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, удзельніца валанцёрскага атрада «Добрае сэрца», нязменна бярэ ўдзел у дабрачынных акцыях «Ветэран жыве побач», «Алімпійскае сэрца». Дзяўчына шмат гадоў займаецца спортам: бег, плаванне, стральба, лыжы. У скарбонцы ўзнагарод дзесяцікласніцы захоўваецца нямала медалёў раённага і абласнога маштабаў, залаты значок «Гатовы да працы і абароны», а яшчэ Юлія Сомава прадстаўляе школу на спаборніцтвах «Абаронца Айчыны» нараўне з хлопцамі!

Ужо шосты год дзяўчына з'яўляецца пастаянным членам школьнай каманды юных інспектараў руху «Кола», якая чацвёрты год запар становіцца пераможцам рэспубліканскага этапу конкурсу. З камандай юная жыхарка Лёзна была і на Міжнародным злёце ЮІР у Анапе, адкуль прывезла перамогу ў намінацыі «Міс ЮІР».

З прафесіяй будучая выпускніца ўжо вызначылася — Юлія абірае вучобу ў ВНУ сілавых структур. У якой канкрэтна — пакуль невядома, але дзяўчына даўно імкнецца да запаветных пагонаў, і не толькі дзеля прыгажосці. «Я смела называю сябе патрыётам сваёй краіны і лічу, што кожны з маіх суайчыннікаў павінен быць ім. Менавіта таму і абіраю будучую прафесію, звязаную са служэннем сваёй краіне. Тым больш што мая энергія не дазваляе сядзець на месцы», — падкрэсліла школьніца.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота «Витебские вести».**

## «ГЭТА ПАЕЗДКА ДАСЦЬ НОВЫ ВОПЫТ У ПАТРЫЯТЫЧНАЙ РАБОЦЕ»



### Маргарыта Крупіца з Гродна лічыць важным наведаць памятныя мясціны Саюзнай дзяржавы

**Вучаніца ваенна-патрыятычнага класа не хавае сваіх эмоцый. І сапраўды, адправіцца на цягніку ў такое цікавае падарожжа выпадае далёка не ўсім. Маргарыце, можна сказаць, пашанцавала. Яна разам з дзесяццю прадстаўнікамі Гродзенскай вобласці апынулася ў складзе ўдзельнікаў міжнароднага праекта «Цягнік Памяці».**

Дзесяцікласніца Маргарыта Крупіца, як і ўсе вучні ваенна-патрыятычных класаў СШ № 3 імя В. Усава, носіць спецыяльную форму і нават мае ўмоўнае званне — старшы сяржант. Вучыцца сюды прыйшла мэтанакіравана, ёй па душы гэты кірунак дзейнасці. І, трэба сказаць, яе партфоліа ўжо даволі значнае. Сёлета стала стыпендыятам абласнога аддзялення Беларускага фонду міру, пераможца патрыятычнай кадэцкай змены вучняў Саюзнай дзяржавы ў дзіцячым аздараўленчым цэнтры «Зубраня», намеснік старшыні рэспубліканскага Маладзёжнага парламента. Дарэчы, вопыт удзелу ў парламенцкай дзейнасці лічыць вельмі карысным.

— Гэта жывы орган, пляцоўка для рэалізацыі сваіх задумак, ідэй, магчымасць праявіць лідарскія якасці. Члены Маладзёжнага парламента прапаноўваюць свае цікавыя праекты, мы аналізуем работу сваіх камісій, праводзім тэматычныя сустрэчы, — паведаміла дзяўчына.

Летась Маргарыта ўжо брала ўдзел у акцыі, якая дала старт праекту «Цягнік Памяці». Праўда, толькі ў складзе сваёй школы. Вучні разам з пасажырамі цягніка ўскладалі кветкі да Вечнага агню. Тады і з'явілася гэта мара — самой далучыцца да праекта. У школе яе імкненне з вялікай ахвотай падтрымалі.

— У мінулым годзе нашы вучні сустракалі цягнік у Гродне, сумесна кветкі ўскладалі, а сёлета наша школа мае і свайго дэлегата на «Цягнік Памяці», — зазначае намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце СШ № 3 Ірына Шайко. — Мы дапамаглі падрыхтавацца да конкурсу, які праходзіў у рэспубліцы пад назвай «Я патрыёт сваёй краіны». Для прэзентацыі быў зроблены відэаролік, эсэ і візітоўка. Гледачы вельмі цёпла прынялі творчы нумар па матывах кінафільма «А досвіткі тут ціхія». Па выніках абласнога конкурсу наша вучаніца Маргарыта Крупіца атрымала пуцёўку на ўдзел у міжнародным праекце «Цягнік Памяці».

На думку прадстаўніка адміністрацыі, паездка мае патрыятычны ўхіл і гэта сугучна з канцэпцыяй школы, якая з 1984 года носіць імя Героя Савецкага Саюза, камандзіра пагранічнай заставы Віктара Усава. Тут заключаны дагавор супрацоўніцтва з Гродзенскай пагранічнай групай і Інстытутам пагранічнай службы Рэспублікі Беларусі. Многія вучні школы становяцца ў будучыні прафесійнымі пагранічнікамі.

Аб ваеннай кар'еры задумвалася і Маргарыта. І невыпадкова. Яе бацька служыць у органах унутраных спраў, прадзеды — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Адзін з іх не вярнуўся з поля бою. Памяць аб іх шануюць у сям'і Маргарыты. А яна сама расцэньвае паездку па месцах баявой славы як набыццё новага вопыту ў сваёй ваенна-патрыятычнай дзейнасці.

— Я думаю, гэта пашырыць мае веды, дасць новы вопыт у будучай патрыятычнай рабоце. Мне давялося пабываць у многіх памятных мясцінах Беларусі, а цяпер змагу наведаць такія месцы ў Расіі. Для мяне як вучаніцы ваенна-патрыятычнага класа гэта вельмі важна. Варта памятаць, ведаць гэтыя мясціны, іх гісторыю. Як сваёй краіны, так і Саюзнай дзяржавы, — кажа дзяўчына. — Да таго ж неабходна наладжваць сяброўскія сувязі з моладдзю іншых краін. І такія крокі мы ўжо робім — стварылі тэлеграм-канал з прадстаўнікамі Расіі, Арменіі, Кыргызстана, якія прымаюць удзел у праекце, пазнаёміліся завочна, чакаем сустрэчы і падарожжа.

Гродзенка кажа, што маршрут вельмі змястоўны. Як па тэрыторыі Беларусі, так і Расіі. Вандроўка расцягнецца амаль на два тыдні і абяцае нямала ўражанняў, якімі падарожнікі, вядома, будуць шчыра дзяліцца.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**